УДК 94 (476)

***Раман Аляксандравіч Сыч***
*аспірант 3-га года навучання каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Raman Sych***
*3-d Year Postgraduate Student of the Department of History of Slavic Peoples*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: roman_brest@mail.ru

# АГЕНТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІЦЫІ ПОЛЬШЧЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг.

*Цяжкае эканамічнае становішча, сацыяльныя праблемы насельніцтва Заходняй Беларусі, а таксама рост колькасці крымінальных злачынстваў, дыскрымінацыя нацыянальных меншасцяў ва ўмовах міжваеннай Польшчы сталі прычынай масавай нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Для процідзеяння распаўсюджванню левaрадыкальных ідэй, барацьбы з нацыянальна-вызваленчым рухам і крыміналам на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. была створана разгалінаваная сетка агентаў (канфідэнтаў і інфарматараў). На падставе архіўных дакументаў і апублікаваных крыніц раскрываецца дзейнасць дзяржаўнай паліцыі Польшчы па вярбоўцы і арганізацыі супрацоўніцтва з агентурай на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Падаюцца дадзеныя пра спосабы вярбоўкі, матывацыю згоды на супрацоўніцтва з паліцыяй, правілы паводзінаў агентаў і зносін з куратарамі, а таксама ўзнагароджанне агентаў і вызначэнне крытэрыяў іх прафесіяналізму.*

***Ключавыя словы:*** *паліцыя, агенты, інфарматар, канфідэнт, інфармацыя, вярбоўка.*

## *Agency Activities of the Polish State Police on the Territory of Western Belarus in 1921–1939*

*The difficult economic situation, social problems of the population of Western Belarus, as well as the increase in criminal offenses, discrimination of national minorities in the conditions of interwar Poland, became the cause of the massive national liberation struggle. The spread of left-wing radical ideas on the territory of Western Belarus in 1921–1939, the fight against the national liberation movement and criminal crimes, an important and effective means was the creation of an extensive network of agents (confidants and informants). The article, based on archival documents and published sources, discloses the activities of the Polish state police in recruiting and organizing cooperation with agents in the territory of Western Belarus in 1921–1939. Data are provided on the method of recruitment, motivation of consent to cooperation with the police, rules of behavior of agents and communication with curators, as well as rewarding agents and defining criteria of professionalism.*

***Key words:*** *police, agents, informer, confidant, information, recruitment.*

### Уводзіны

Для забеспячэння задач па барацьбе з апазіцыйнымі сіламі і злачыннымі групоўкамі дзяржаўная паліцыя Польшчы актыўна выкарыстоўвала агентурную працу – адну з найбольш важных частак аператыўнай дзейнасці праваахоўных органаў. У артыкуле пад агентурнай дзейнасцю разумеецца стварэнне прадстаўнікамі паліцыі агентурнай сеткі (падбор кандыдатаў, вярбоўка, пастаноўка задачы, праверка дзейнасці і г. д.) для тайнага збору інфармацыі і яе перадачы, а пры неабходнасці і выканання іншых пастаўленых задач.

У айчыннай гістарыяграфіі пытанні стварэння і дзейнасці дзяржаўнай паліцыі Польшчы і яе структур у Заходняй Беларусі амаль не распрацоўваліся [1; 2]. У асноўным даследчыкі ў ходзе распрацоўкі той ці іншай праблематыкі разглядалі толькі асобныя аспекты дзейнасці паліцыі [3–5].

У польскай гістарыяграфіі тэма паліцыі распрацавана больш грунтоўна, у тым ліку і пытанне агентурнай дзейнасці паліцыі [6–9]. Разам з тым дзейнасць польскай паліцыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі да гэтага часу не знайшла належнага навуковага асвятлення і таму патрабуе прадметнага вывучэння.

### Асноўная частка

Паводле Статута паліцыі Польшчы 1919 г. паліцыя – гэта дзяржаўная арганізацыя, утвораная для захавання бяспекі, спакою і парадку ў краіне [10]. З гэтай мэтай паліцыя збірала, аналізавала і падавала ін-

*Навуковы кіраўнік – Аляксандр Аляксандравіч Савіч, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дэкан гістарычнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*

фармацыю адпаведным дзяржаўным органам. У справах захавання бяспекі паліцыя падпарадкоўвалася адміністрацыі – павятовым старастам і ваяводзе. Кіраўнікі адміністрацыйных адзінак былі зацікаўлены ў атрыманні інфармацыі аб эканамічнай, сацыяльна-палітычнай, нацыянальнай і рэлігійнай сітуацыі, аб тым, што магло пагражаць грамадскай бяспецы. Збіралася інфармацыя пра маладзёжныя, парамілітарныя, ветэранскія, культурна-асветніцкія, жаночыя, прафсаюзныя, рэлігійныя арганізацыі, а таксама пра легальныя і нелегальныя палітычныя арганізацыі [7, с. 429, 433].

Адпаведныя «паслугі» паліцыі тайна аказвалі канфідэнты і інфарматары. Паміж імі ёсць сур'ёзныя адрозненні, бо канфідэнт – гэта асоба, акая падавала інфармацыю пра арганізацыю, непасрэдна з'яўляючыся яе членам, а інфарматар меў доступ і збіраў інфармацыю пра арганізацыю, але фармальна ў яе склад не ўваходзіў [11, с. 75].

Канфідэнт непасрэдна падпарадкоўваўся свайму кіраўніку ад паліцыі, перадаваў яму сабраную інфармацыю і атрымліваў узнагароджанне. Інфармацыя, атрыманая праз канфідэнта, правяралася павятовым камендантам паліцыі, пасля чаго трапляла ў аддзел расследаванняў, стараства або ў павятовую камендатуру.

Далей звесткі пастпалі ваяводскай адміністрацыі і правяраліся ў яе сацыяльна-палітычным аддзеле [7, с. 436, 439–441]. На ўсіх этапах атрыманая інфармацыя праправяраліся, часта праз створаныя прадстаўнікамі адміністрацыі агентурныя сеткі [7, с. 440, 444; 12, с. 20].

Канфідэнтаў можна падзяліць на некалькі груп. Паводле ступені інфармаванасці выдзяляюцца свядомыя (ведаюць свае абавязкі, мэты працы, могуць працаваць у розных асяродках) і несвядомыя (не ведаюць, што дзякуючы ім збіраецца інфармацыя з іх асяродку, маламабільныя, пры «ўцечцы» інфармацыі могуць парваць кантакты з скампраметаванай асобай).

Па часе супрацоўніцтва з паліцыяй канфідэнты дзяліліся на сталых (яны працавалі доўгі час у пэўнай арганізацыі, якая нават пры ліквідацыі не прыпыняла сваёй дзейнасці. Заданнем такіх агентаў быў нагляд за жыццём і дзейнасцю арганізацыі. Прыкладамі такіх арганізацый з'яўляюцца камуністычная партыя, пэўныя нацыянальныя групы, дзе канфідэнт выконваў сваю ролю нават праз доўгі адрэзак часу) і выпадковых, паслугі якіх патрэбны на нейкі час і неабходны для выяўлення злачынных дзеянняў і іх ліквідацыі альбо для адпрацоўкі канфідэнтам канкрэтнага задання (устанаўлення факта злачынства, выяўлення датычных асоб і збору доказаў віны). Вярбоўка такіх асоб у значнай ступені залежала ад кіраўніка мясцовай паліцыі, ад яго асабістых якасцяў і стасункаў з мясцовымі жыхарамі [13, с. 2].

Па ступені матывацыі выдзяляліся неаплатныя ці ідэйныя (найбольш каштоўныя). Жаданне супрацоўнічаць з органамі бяспекі залежала менавіта ад выхавання, якое атрымаў чалавек, ад усведамлення ім сваіх абавязкаў у адносінах да дзяржавы. У большасці выпадкаў гэта быў інтэлігентны, матэрыяльна незалежны чалавек, які трактаваў сваю справу з пункту гледжання карысці для дзяржавы і стараўся падаць сабраны матэрыял як найдакладней. Такімі канфідэнтамі паліцыя карысталася для працы ў нелегальных палітычных арганізацыях.

Яшчэ былі платныя агенты (падавалі інфармацыю больш сцісла, аднак з мэтай заробку нават да малазначнай справы маглі дадаць непатрэбныя дэталі. Яны даволі хутка дэмаралізаваліся, таму такіх асоб рэкамендавалася выкарыстоўваць абмежаваны час ці для канкрэтных задач [13, с. 2].

Узнагароджанне (аплата) канфідэнта залежала ад індывідуальнай ацэнкі кіраўніком вартасці яго работы. Куратар агента павінен быў валодаць інфармацыяй аб неабходных для канфідэнта сродках і яго матэрыяльным стане. Удакладнялася, што вельмі важна пазбягаць канфліктаў, звязаных з выплатай грошай: «Нічога так не дэмаралізуе канфідэнта, як абяцанне і нестрымліванне свайго слова» [13, с. 4адв.]. У той жа час нельга было даваць зашмат грошай, бо гэта таксама дэмаралізавала тайнага супрацоўніка. Канфідэнт, працуючы для выгады, як правіла, меў на мэце атрыманне вялікіх грошай. Для працы з ім найлепшым было дакладнае акрэсленне задання і сумы ўзнагароджання [13, с. 4адв., 5]. Да прыкладу, канфідэнту ў 1926 г. за справаздачы плацілі ад 10 да 45 злотых [14, с. 2]. У 1930-я гг. памеры выплат знізіліся і складалі ад 5 да 15 злотых [15, с. 3–11]. Больш каштоўным

агентам плацілі значна больш – да 100 злотых і болей за справаздачу [3, с. 24; 16, с. 2]. Але было шмат і неаплатных канфідэнтаў, што магло ўплываць на эфектыўнасць іх працы, таму некаторыя кіраўнікі прасілі для сваіх агентаў «хаця б невялікае ўзнагароджанне» [17, с. 18].

Задачамі канфідэнта, які праводзіў выведку сярод падазроных груповак, быў збор інфармацыі пра жыццё арганізацыі і яе праявы; выяўленне асоб, якія ўваходзілі ў яе склад; прадастаўленне інфармацыі пра сходы і канферэнцыі (час, месца, асабовы склад); давядзенне інфармацыі пра магчымасці арганізацыі, яе ўплыў на іншыя палітычныя арганізацыі і прафесійныя саюзы; збор доказаў антыдзяржаўнай работы, якія нельга сабраць пры дапамозе знешняй выведкі ці метадамі паліцыі; падрыў непажаданых суполак у выніку правядзення «дэструктыўных дзеянняў у антыдзяржаўным асяродку» [5, с. 216; 13, с. 2адв.].

Калі канфідэнт працаваў па канкрэтнай справе, то яму павінны былі даць дакладны спіс пытанняў, па якіх яму неабходна было сабраць інфармацыю. Было пажадана не абмяжоўваць ініцыятыву канфідэнта, бо дзякуючы яго інтарэсу можна было атрымаць і іншыя каштоўныя дадзеныя. Але ў той жа час канфідэнт не меў права праяўляць ініцыятыву ў дзейнасці арганізацыі, а толькі выконваў сваё заданне. Пасля выканання даручэння ён павінен быў паведаміць пра свае дзеянні і вынікі ў паліцыю. Добрая праца канфідэнта павінна была даць столькі і такога матэрыялу, каб паліцыя магла свабодна выбраць час і месца для пачатку рэалізацыі аператыўных мерапрыемстваў, у тым ліку і па ліквідацыі арганізацыі [13, с. 2адв., 4–4адв.]. Матывы згадзіцца стаць канфідэнтам былі розныя: патрыятызм польскі, жаданне прыгод, помста, атрыманне выгады, жыццёвыя абставіны. Частай з’явай было ўяўленне аб працы канфідэнта як лёгкай, прывабнай і высокапрыбытковай [13, с. 2адв.].

Вярбоўка канфідэнта залежала ад вялікай колькасці абставін, у тым ліку ад таго, хто праводзіў вярбоўку, яго адносін да асобы, якая ўяўляе цікавасць для вярбоўшчыка. Найбольшы практычны вынік давала вярбоўка агента непасрэдна будучым яго кіраўніком (куратарам). Прымянялі розныя спосабы вярбоўкі. Была несвядомая вярбоўка (збор інфармацыі ў выглядзе абмену плёткамі і навінамі, з выкарыстаннем сяброўскіх ці прыяцельскіх зносіны); «мядовая пастка» (збор інфармацыі праз жанчыну). Аднак канстатавалі, што жанчынам-канфідэнткам не хапала «сістэматычнасці, цярплівасці» і што ў іх нельга быць упэўненым: «часта здаралася, што жанчына, як асоба чуллівая, псуе цэлую справу»; праз абяцанні і пагрозы (абяцанні вырашыць праблемы з законам ці паменшыць пакаранне, а таксама шантаж, кампраметацыя і інш.); выкарыстанне грашовага фактару; праз псіхалагічныя і фізічныя ўздзеянні падчас арышту; праз жаданне помсты (канфліктныя сітуацыі ў арганізацыях). Інфармацыя ад такіх асоб была важнай, але даволі тэндэнцыйнай [13, с. 3–4; 16, с. 103, 121–122, 140, 221; 18, с. 84].

Бывалі выпадкі, што вербавалі праз пагрозы альбо фармальна запісвалі ў агенты і інфарматары асоб, якія ніяк не былі зацікаўлены ў такой «працы» [2, с. 37]. Эфектыўнасць такіх «агентаў» была вельмі малая, калі наогул была.

Для збору інфармацыі паліцыя мэтанакіравана шукала і вербавала асоб, якія працавалі ў публічных месцах: на чыгуначных станцыях, у гатэлях, рэстаранах і г. д. У гарадах найчасцей вербавалі вартаўнікоў, дворнікаў, праваднікоў на цягніках, кандуктараў аўтобусаў, у вёсках – асаднікаў, солтысаў, заможных сялян, леснікоў. Пасля вярбоўкі канфідэнт павінен быў працягваць сваё звычайнае жыццё, нічога нельга было рэзка змяняць. Выкананне гэтай умовы было неабходным і ў сувязі з тым, што агенты не маглі валодаць службовай зброяй і пасведчаннем.

Паліцыя вяла дакладны ўлік канфідэнтаў, асабліва платных, і па магчымасці мець іх фотаздымкі. Улік павінен быў весціся таемна, без ведама канфідэнтаў, а дакументы надзейна захоўваўся ў кіраўніка. На кожнага канфідэнта заводзілася справа, дзе адлюстроўвалася персанальная інфармацыя: імя і прозвішча, дата нараджэння, месца пражывання, занятак, імёны родзічаў, апісанне знешняга выгляду, псеўданім, адбітак пальца, выплачаныя сумы ўзнагароджання, заява аб прыняцці псеўданіма і абавязку падаваць праўдзівую інфармацыю, справаздачы і інш. [14, с. 2–9]. Меліся і агульныя спісы канфідэнтаў і інфарматараў

паліцыі, дзе змяшчалася іншая інфармацыя: імя і прозвішча, псеўданім, нумар справы, месца пражывання, у якой справе быў задзейнічаны, характарыстыка, ацэнка працы, дата вярбоўкі і звальнення [19, с. 1].

Службовыя зносіны канфідэнта з прадстаўніком паліцыі павінны былі адбывацца толькі з асобай, якая яго завербавала, ці з кіраўніком аддзела паліцыі альбо яго намеснікам. У рэдкіх выпадках дазваляўся кантакт з іншымі прадстаўнікамі паліцыі. Нельга было нейкім чынам раскрываць сябе: паказваць свае стасункі з прадстаўнікамі паліцыі, дзяржслужачымі, знаёміцца з іншымі агентамі. Інфармацыю патрэбна было перадаваць незаўважна, напрыклад, у выглядзе размовы двух знаёмых, падчас санітарнага абходу паліцыі, патруля і г. д. Дазвалялася перадаваць інфармацыю і ў пісьмовай форме, але з шэрагам перасцярог: падпісваць пісьмо псеўданімам, лічбамі, напісанне тэксту тайным атрамантам і г. д. [13, с. 5–6].

Большасць канфідэнтаў не толькі не былі прафесіяналамі, але і слаба разумела сутнасць працы, у выніку чаго былі выпадкі збору недастатковай колькасці доказаў, і таму справы развальваліся ў судах ці грунтаваліся толькі на паказаннях канфідэнтаў [3, с. 24]. Куратар канфідэнта павінен быў правесці інструктаж і яго першапачатковае навучанне, але гэта палажэнне не заўсёды выконвалася. Было шмат выпадкаў, калі насельніцтва лёгка выяўляла агентаў паліцыі і проста збівала, як гэта адбылося ў снежні 1933 г. на танцах у в. Бучацічы Кобрынскага павета [4, с. 61]. Выяўленых канфідэнтаў насельніцтва байкатавала, што пазбаўляла іх каштоўнасць у вачах паліцыі, і іх пераводзілі ў катэгорыю інфарматараў [15, с. 6]. Гэтыя факты сведчаць пра нізкі прафесіяналізм як канфідэнтаў, так і іх кіраўнікоў. Шмат канфідэнтаў звальнялі праз 1–2 гады ад часу вярбоўкі па прычыне няякаснай працы, п’янства, няўмення захоўваць канспірацыю, змены працы і месца жыхарства і інш. [19, с. 1–5].

Значную колькасць канфідэнтаў мэтанакіравана выкарыстоўвалі для выведкі па канкрэтных крымінальных справах, распрацоўцы палітычных арганізацый на акрэсленай тэрыторыі і г. д.; пасля яны маглі губляць сваю каштоўнасць [15, с. 897; 20, с. 1–6]. Найбольш эфектыўны спосаб атрымання неабходнай інфармацыі – мэтанакіраванае ўвядзенне падрыхтаванага канфідэнта ў склад арганізацыі, на што быў патрэбны час, доўгая праца і грошы. Паліцыі неабходна было мець у арганізацыі не менш за двух канфідэнтаў для пацвярджэння дакладнасці інфармацыі [13, с. 3адв.].

Вызначыць, колькі было канфідэнтаў і інфарматараў на тэрыторыі Заходняй Беларусі, немагчыма. Шэраг матэрыялаў быў знішчаны ў 1939 г., штосьці падчас Вялікай Айчыннай вайны, некаторая інфармацыя наогул не знайшла свайго адлюстравання ў паперах. Таму высновы можна рабіць выключна па тых дадзеных, якія захаваліся. Так, у 1937 г. толькі на тэрыторыі Брэсцкага павета паліцыя мела 18 канфідэнтаў і 182 інфарматары, а павятовыя пастарункі – 497 інфарматараў [21, с. 1–2]. Аб прыблізнай колькасці агентаў паліцыі можна гаварыць зыходзячы з дадзеных наркама ўнутраных спраў БССР Л. Цанавы пра арыштаваных у Заходняй Беларусі ад 27 лістапада 1939 г.: «Усяго арыштавана ці пад следствам – 5 845 чалавек. З іх шпіёны ці падазраваемыя ў шпіянажу – 1 139, агентаў паліцыі – 1 009, правакатараў – 177» [16, с. 301].

**Заключэнне**

Такім чынам, дзяржаўная паліцыя Польшчы для атрымання неабходнай інфармацыі выкарыстоўвала інфарматараў і канфідэнтаў як найважнейшы сродак у барацьбе са злачыннасцю і антыдзяржаўнай дзейнасцю. Завербаваных канфідэнтаў уводзілі ў склад арганізацыі ці злачыннага асяродка. Для своечасовага атрымання інфармацыі паліцыя стварала сеткі тайных, добра заканспіраваных агентаў, якія знаходзіліся ў цесных кантактах з прадстаўнікамі паліцыі і інфармавалі аб праявах грамадска-палітычнага жыцця ў дзяржаве. Станоўчыя вынікі працы паліцыі ў 1930-я гг. дазваляюць зрабіць выснову, што ў 1921–1939 гг. польскі ўрад пабудаваў эфектыўную выведную структуру ўнутры дзяржавы.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Мисиюк, Е. В. Полиция г. Бреста в межвоенный период: организация, структура, деятельность / Е. В. Мисиюк // Матэрыялы Другой міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай памяці прафесара У. У. Мелішкевіча. – Брест : Альтернатива, 2004. – С. 259–264.

2. Трафімчык, А. Т. Сілавыя органы польскай улады ў сельскай мясцовасці Заходняй Беларусі / А. Т. Трафімчык // Беларус. гіст. часоп. – 2021. – № 7. – С. 34–38.

3. Лугачева, Т. А. Международная организация помощи революционерам (МОПР) в Западной Беларуси (1923–1939 гг.) / Т. А. Лугачева. – Гродно : ГрГУ, 2001. – 114 с.

4. Загідулін, А. М. Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Загідулін. – Гродна : ГрДУ імя Янкі Купалы, 2010. – 183 с.

5. Крывуць, В. І. Барацьба за маладое пакаленне Заходняй Беларусі і праўрадавы маладзёжны рух (1926–1939 гг.) / В. І. Крывуць. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2013. – 272 с.

6. Misiuk, A. Policja Państwowa 1919–1939: powstanie, organizacja, kierunki działania / A. Misiuk. – Warszawa : PWN, 1996. – 370 s.

7. Mierzwa, J. Starostowie Polski międzywojennej. Portret zbiorowy / J. Mierzwa. – Kraków : Historia Iagellonica, 2018. – 647 s.

8. Śleszyński, W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszyński. – Warszawa : RYTM, 2007. – 400 s.

9. Pepłoński, A. Kontrwywiad II Rzeczypospolitej / A. Pepłoński. – Warszawa : Bellona, 2002. – 376 s.

10. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1919/s/5/98. – Дата доступу: 21.08.2023.

11. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 93. Воп. 2. Спр. 23.

12. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 50.

13. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 3031.

14. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 636.

15. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 897.

16. НКВД в Западной Беларуси: сентябрь – декабрь 1939 г. : док. и материалы. – Минск ; М. : Фонд «Ист. память», 2019. – 384 с.

17. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 863.

18. У суровыя гады падполля : зб. успамінаў. – Мінск : Дзяржвыд-ва БССР, 1958. – 361 с.

19. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 3063.

20. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 1746.

21. ДАБр. – Ф. 93. Воп. 1. Спр. 2637.

## REFERENCES

1. Misijuk, Ye. V. Policija g. Briesta v miezhvoennyj pieriod: organizacija, struktura, diejatiel'nost' / Ye. V. Misijuk // Materyjaly Druhoj mizhnarodnaj navukova-praktychnaj kanfierencyi prysviechanaj pamiaci prafiesara U. U. Mielishkievicha. – Brest : Al'ternativa, 2004. – S. 259–264.

2. Trafimchyk, A. T. Silavyja orhany pol'skaj ulady u siel'skaj miascovasci Zakhodniaj Bielarusi / A. T. Trafimchyk // Bielarus. hist. chasop. – 2021. – № 7. – S. 34–38.

3. Lugachieva, T. A. Miezhdunarodnaja organizacija pomoshchi rievoliucionieram (MOPR) v Zapadnoj Bielarusi (1923–1939 gg.) / T. A. Lugachieva. – Grodno : GrGU, 2001. – 114 s.

4. Zahidulin, A. M. Bielaruskaje pytannie u pol'skaj nacyjanal'naj i kanfiesijnaj palitycy u Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / A. M. Zahidulin. – Hrodna : HrDU imia Yanki Kupaly, 2010. – 183 s.

5. Kryvuc', V. I. Barac'ba za maladoje pakaliennie Zakhodniaj Bielarusi i prauradavy maladziozhny rukh (1926–1939 hh.) / V. I. Kryvuc'. – Baranavichy : RVA BarDU, 2013. – 272 s.

6. Misiuk, A. Policja Państwowa 1919–1939: powstanie, organizacja, kierunki działania / A. Misiuk. – Warszawa : PWN, 1996. – 370 s.

7. Mierzwa, J. Starostowie Polski międzywojennej. Portret zbiorowy / J. Mierzwa. – Kraków : Historia Iagellonica, 2018. – 647 s.

8. Śleszyński, W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej / W. Śleszyński. – Warszawa : RYTM, 2007. – 400 s.

9. Pepłoński, A. Kontrwywiad II Rzeczypospolitej / A. Pepłoński. – Warszawa : Bellona, 2002. – 376 s.

10. Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej [Eliektronny resurs]. – Rezhym dostupu: http://dziennikustaw.gov.pl/DU/1919/s/5/98. – Data dostupu: 21.08.2023.

11. Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci (DABr). – F. 93. Vop. 2. Spr. 23.

12. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 50.

13. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 3031.

14. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 636.

15. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 897.

16. NKVD v Zapadnoj Bielarusi: sientiabr' – diekabr' 1939 g. : dok. i matierialy. – Minsk ; M. : Fond «Ist. pamiat'», 2019. – 384 s.

17. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 863.

18. U surovyja hady padpollia : zb. uspaminau. – Minsk : Dziarzhvyd-va BSSR, 1958. – 361 s.

19. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 3063.

20. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 1746.

21. DABr. – F. 93. Vop. 1. Spr. 2637.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.10.2023*